Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
ВІЦЕБСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ П.М. МАШЕРОВА

УДК: 808.26--3
Номер госрэгістрацыі: 20063271
Інв.№

Зацвярджаю
Рэктар УА «ВДУ імя П.М. Машэрава»
прафесар __________ А.У. Русецкі
«04» ________ 2008 г.

# С П Р А В А З Д А Ч А
## аб навукова-даследчай рабоце
## ВІЦЕБШЧЫНА Ў НАЗВАХ ВУЛІЦ
(заключны)
дагавор с БРФФД №Г 06-029 ад 01.04. 2006 г.

**Навуковы кіраўнік НДР**
доктар філалагічных
навук прафесар __________ 3.03.08 Г.М. Мезенка
подпіс, дата

**Нормакантролёр** __________ 3.03.08 А.М. Галкін
подпіс, дата

Віцебск 2008

Установа адукацыі
«Віцебскі дзяржаўны універсітэт
імя П.М. Машэрава»
НАВУКОВАЯ БІБЛІЯТЭКА

# СПІС ВЫКАНАЎЦАЎ

Навуковы кіраўнік тэмы,
докт.філал.навук,
прафесар ______ 3.03.08 Г.М. Мезенка (асноўная частка, заключэнне)
подпіс,дата

Выканаўцы тэмы:

Ст.навковы супр.,
канд.філал. навук ______ 3.03.08 Г.М. Дзеравяга (уводзіны, літаратура)
подпіс, дата

Лабарант ______ 3.03.08 Н.А. Захарава (камп'ютарны набор)
подпіс,дата

Рэферат

Справаздача 73старонкі, 1кн., дадатак 2 кн., 51 крыніца.

**Ключавыя словы** (словазлучэнні), якія найбольш поўна адлюстроўваюць змест праекта: *урбанонім, урбананімія, урбананімікон, гадонім, агаронім, эклезіонім, віконім, віканімія, віканімікон, намінацыя, рэнамінацыя (перайменаванне), анімізацыя, трансанімізацыя.*

**Актуальнасць** даследавання тлумачыцца нізкай ступенню распрацаванасці праблем урбананімікі і віканімікі, нізкім выкарыстаннем урбананімных і віканімных адзінак пры вывучэнні гісторыі Беларусі і гісторыі беларускай мовы, адсутнасцю поўных зводаў унутрыгарадскіх і асабліва ўнутрысельскіх назваў

**Аб'ектам даследавання** з'яўляецца урбананімія і віканімія Віцебшчыны XX і XXI стст.

**Задачы даследавання:** 1) сабраць урбананімную і віканімную лексіку па 248 сельсаветах, 21 раёна Віцебскай вобласці;

2) пералічыць усе населеныя пункты, у якіх існавала канкрэтная назва ўнутрыгарадскога аб'екта;

3) прасачыць фарміраванне назваў гаданімнай і агаранімнай зон анімічнай прасторы;

4) раскрыць паходжанне назваў унутрыгарадскіх і ўнутрысельскіх аб'ектаў;

5) вызначыць перайменаванні ўнутрыгарадскіх і ўнутрысельскіх аб'ектаў, якія адбываліся ў другой палавіне XX – пач. XXI ст.;

6) зафіксаваць страчаныя назвы ўнутрыгарадскіх і ўнутрысельскіх аб'ектаў;

7) выявіць матывацыю урбанонімаў і вiконімаў розных тыпаў;

8) прывесці па магчымасці зводы ўнутрыгарадскіх і ўнутрысельскіх назваў мінулых часоў.

**Мэта даследавання** – вывучыць стан сучаснай урбананіміі і віканіміі Віцебскай вобласці, шляхі ўзнікнення і станаўлення назваў унутрыгарадскіх і ўнутрысельскіх аб'ектаў.

**Навуковая гіпотэза** аўтара грунтуецца на наступным. Найважнейшымі захавальнікамі былой і сучаснай гісторыі горада з'яўляюцца ўнутрыгарадскія назвы лінейных (вуліц, завулкаў, праспектаў і інш.), тэрытарыяльных (плошчаў, сквераў, паркаў, рынкаў і інш.) і маштабных аб'ектаў, якія, на жаль, у апошнія 80 гадоў з незвычачайнай лёгкасцю пераймяноўваліся, асобныя па два, тры і нават больш разоў. Канец XX ст. азнаменаваўся адваротным працэсам паступовага вяртання вуліцам, завулкам, плошчам іх спрадвечных гістарычных найменняў. Усё гэта складае цяжкасці не толькі ідэнтыфікацыі, паколькі ў крыніцах у розныя часы адны і тыя ж унутрыгарадскія аб'екты імянуюцца па-рознаму, але і поўнай фіксацыі ўсіх існуючых назваў вуліц, праспектаў, трактаў і інш. Паколькі поўнага зводу назваў унутрыгарадскіх аб'етаў Віцебшчыны наогул ніколі не існавала відавочная неабходнасць стварэння слоўніка, які змесціць поўную інфармацыю пра ўсе існуючыя ў наш час назвы вуліц віцебскага рэгіёна. У слоўнік уключаны назвы вуліц і іншых аб'ектаў практычна ўсіх гарадоў, абласных і раённага падпарадкавання, гарадскіх пасёлкаў і большасці вёсак, у якіх ёсць назвы лінейных і тэрытарыяльных аб'ектаў.

**Метады даследавання.** Падчас збору урбананімнага і віканімнага матэрыялу ў рабоце выкарыстоўваліся прыёмы апытання інфармантаў, суцэльнае даследаванне архіўных, кадастравых матэрыялаў і ідэнтыфікацыі урбанонімаў і віконімаў. Асноўнымі метадамі даследавання з'яўляюцца *апісальны*, які ўключае прыёмы знешняй і ўнутранай інтэрпрэтацыі, *гісторыка-параўнальны*, які ўключае прыёмы храналагізацыі, культурна-гістарычнай інтэрпрэтацыі, выяўлення гісторыі асобных найменняў, элементы *статыстычнага*, а таксама прыватныя прыёмы анамастычнага даследавання: *генетычны аналіз* урбанонімаў і віконімаў, *этымалагічны, словаўтваральны, структурны аналіз* урбананімных і віканімных асноў і інш.

Урбананімныя і віканімныя выбаркі з пералічаных крыніц склалі **матэрыял** даследавання. У картатэцы налічваецца звыш 5000 унутрыгарадскіх і ўнутрысельскіх найменняў.

**Навуковая навізна даследавання** заключаецца ў вызначэнні граніц урбананімнай і віканімнай прасторы, а таксама ў тым, што рэгіянальная віканімія да нашага часу не была прадметам спецыяльнага вывучэння.

**Вынікі даследавання**. У выніку даследаванняў, праведзеных на працягу 2006 —2008 гг.:

- упершыню ў айчыннай анамастыцы зроблена тэарэтычнае абгрунтаванне віканімікі як асобнага раздзела тапанімікі;
- абгрунтавана сутнасць назваў унутрыгарадскіх і ўнутрысельскіх аб'ектаў, выяўлены агульныя і прыватныя рысы віконімаў, сфармуляваны адрозненні паміж урбананіміяй і віканіміяй;
- прасочана фарміраванне гаданімнай і агаранімнай зон анамастычнай прасторы;
- выяўлены ўсе населеныя пункты гарадскога тыпу Віцебскай вобласці і сельскія населеныя пункты, у якіх ёсць лінейныя аб'екты;
- створана картатэка назваў гарадскіх і сельскіх лінейных аб'ектаў;
- вывучаны і апрацаваны дадзеныя Нацыянальнага кадастравага агенцтва;
- установлены ўсе населеныя пункты, у якіх існавала пэўная назва ўнутрыгарадскога / унутрысельскага аб'екта;
- вывучаны працэс намінацыі ўнутрысельскіх аб'ектаў;
- вывучаны дадзеныя краязнаўчых музеяў гарадоў Браслаў, Пастравы, Полацк;

- створаны этымалагічны даведнік урбанонімаў і віконімаў Віцебшчыны;
- вызначаны перайменаванні ўнутрыгарадскіх і ўнутрысельскіх аб'ектаў краю, што мелі месца ў XX ст.;

**Магчымыя галіны выкарыстання вынікаў** – анамастыка, гісторыя мовы, лінгвакраіназнаўства, культуралогія, гісторыя Беларусі, краязнаўства.

Унутрыгарадскія і ўнутрысельскія назвы – важны грамадскі феномен. Вывучаныя і прадстаўленыя ў нашым даследаванні задзейнічаныя матывы намінацыі вуліц, завулкаў, плошчаў Віцебшчыны могуць быць выкарыстаны пры намінацыі лінейных аб'ектаў у іншых рэгіёнах Беларусі і замежжа.

# ЗМЕСТ


| | |
|---|---|
| Спіс прынятых скарачэнняў | 8 |
| Уводзіны | 10 |
| 1. Унутрыгарадскія – унутрысельскія назвы: падабенства і адрозненні | 16 |
| 2. Унутрыгарадскія—унутрысельскія назвы і другасная атрыбуцыя | 30 |
| 3. Унутрыгарадскія—унутрысельскія назвы і гендэр | 38 |
| 4. Унутрыгарадскія—унутрысельскія назвы і кагнітыўны ўзровень моўнай асобы | 47 |
| 5. Унутрыгарадскія – унутрысельскія назвы і светабачанне народа | 58 |
| 6.Заключэнне | 61 |
| 6.1. Урбанонімы і віконімы -- асобныя разрады тапонімаў | 61 |
| 6.2. Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці урбананіміі і віканіміі на мяжы стагоддзяў | 63 |
| 7. Перспектывы далейшага развіцця і практычнага выкарыстання атрыманых вынікаў. | 67 |
| Спіс выкарыстаных крыніц | 69 |